*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск
*I. A. Sorokovik*
Academy of management under the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 351.74 (091) (476)**

# БАРАЦЬБА МІЛІЦЫІ БЕЛАРУСІ З П'ЯНСТВАМ І АЛКАГАЛІЗМАМ. 1965–1991 гг.

# FIGHTING POLICE OF BELARUS WITH DRUNKENNESS AND ALCOHOLISM. 1965–1991

*Артыкул прысвечаны барацьбе міліцыі Беларусі з п'янствам і алкагалізмам у 1965–1991 гг. Падрыхтаваны на аснове архіўных матэрыялаў, упершыню ўведзеных у навуковы зварот.*

*Ключавыя словы: міліцыя; барацьба; п'янства; алкагалізм; БССР; ЦК КПБ; Савет Міністраў БССР; Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР.*

*The article is devoted to the struggle police of Belarus with drunkenness and alcoholism in 1965–1991 Prepared on the basis of archival materials, first introduced in the scientific bypass.*

*Key words: police; fighting; drunkenness; alcoholism; BSSR; the Central Committee of the PBC; the Council of Ministers of Belarus; the Presidium of the Supreme Soviet of the BSSR.*

Пытанне барацьбы міліцыі Беларусі з п'янствам і алкагалізмам у 1965–1991 гг. тэзісна разглядалася ў «Очерках истории милиции Белорусской ССР. 1917–1987», аднак не стала прадметам спецыяльнага навуковага даследавання. Між іншым многія супрацьпраўныя дзеянні здзейснены на аснове п'янства і алкагалізму. Таму аўтар вырашыў запоўніць гэты прабел.

Традыцыйнымі кірункамі аховы грамадскага парадку з'яўляліся барацьба з п'янствам, алкагалізмам, наркаманіяй, бадзяжніцтвам, жабраваннем і іншымі відамі правапарушэнняў. Найбольш распаўсюджаным і ўстойлівым з іх з'яўлялася п'янства. У дзяржаве складвалася парадаксальная сітуацыя: з аднаго боку, з кожным годам яна павялічвала выпуск алкагольных напіткаў як адной з асноўных і стабільных крыніц папаўнення дзяржбюджэту. Аднак такое павелічэнне ўскосна садзейнічала і павелічэнню п'янства. З другога боку, яна прымала акты, накіраваныя на барацьбу з п'янствам і алкагалізмам. Вырашэнне гэтай супярэчнасці даручалася міліцыі адміністрацыйнымі мерамі.

Негатыўнае ўздзеянне п'янства і алкагалізму было не толькі на быт, вытворчасць, але і на рост розных відаў правапарушэнняў. У 1965 г. на глебе п'янства ў рэспубліцы было ажыццёўлена кожнае другое крымінальнае злачынства, больш паловы наўмысных забойстваў і замахаў на забойствы, 66 % згвалтаванняў і 82,9 % хуліганскіх праяў [1, арк. 309].

Кіраўніцтва рэспублікі імкнулася сваімі сіламі вырашыць гэту праблему. У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 5 лютага 1965 г. у 1966 г. у г. Светлагорску быў адкрыты лячэбна-працоўны прафілакторый (ЛПП) Міністэрства аховы грамадскага парадку (МАГП) БССР. Пытанне аб накіраванні ў яго злосных п'яніц разглядалася раённым (гарадскім) судом, які выносіў пастанову аб прымусовым лячэнні тэрмінам ад шасці месяцаў да двух гадоў. Час знаходжання у ім залічваўся ў агульны працоўны стаж. Зарплата ўтрымліваемым алкаголікам налічвалася ў памеры 70 % іх зарплаты, памер атрымоўваемай пенсіі змяншаўся на 50 %. Гарантаванае харчаванне выдавалася па норме сутачнага забеспячэння № 2, хворым, змешчаным у стацыянар, – па норме № 6, а змешчаным у ізалятар – па норме № 10, прымяняемых у месцах пазбаўлення волі. У прафілакторыі з напаўненнем 1000 чалавек было прадугледжана 37 супрацоўнікаў медыцынскага персаналу і 50 – кантралёрскай службы, утрымліваемых за кошт прафілакторыя. Толькі за дзевяць месяцаў 1966 г. ЛПП даў перавышэнне прыбытку над расходамі ў суме 57,4 тыс. руб. [2, арк. 4]. Аднак ён не вырашаў праблему адносна злосных п'яніц, бо на ўліку ў міліцыі ў гэтым годзе іх знаходзілася 4239, а ў медыцынскіх працвярэзніках пабывала 62 736 чалавек [3, арк. 31], у 1970 г. – 75 003 чалавекі [4, арк. 16].

Улічваючы такое становішча, Савет Міністраў СССР у пастанове ад 15 студзеня 1970 г. планаваў на 1971–1975 гг. у БССР пашырыць сетку такіх ЛПП. Дзяржплан БССР сумесна з МУС БССР і Міністэрствам аховы здароўя БССР лічылі мэтазгодным утварэнне другога ЛПП на 600 чалавек [5, арк. 93, 96]. Значыць, дзяржаўныя органы ў справе вырашэння гэтай сацыяльнай праблемы схіліліся да прасцейшага, але далёка не вырашальнага варыянта.

Становішча з п'янствам выклікала занепакоенасць і ў кіраўніцтва МАГП БССР. Аднак вырашэнне праблемы сіламі міліцыі, як бачна з загаду ад 28 мая 1966 г. аб задачах органаў АГП МАГП БССР па выкананню пастановы Прэзідыума ЦК КПБ ад 23 красавіка 1966 г. «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы з п'янствам і самагонаварэннем», бачылася толькі ў тым, каб асабісты склад сістэмы МАГП БССР вывучыў гэту пастанову; абагуліць матэрыялы аб фактах п'янства і самагонаварэння і інфармаваць аб гэтым рэгулярна партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі; абагуліць лепшы вопыт работы міліцыі ў гэтым кірунку і выдаць агляд аб ім [1, арк. 310–316].

Падобныя меры былі не лішнімі. Аднак, падаецца, міністэрства павінна было праз вышэйшыя органы рэспублікі ініцыіраваць даследаванне прычын п'янства і алкагалізму і на іх аснове вырашэнне гэтай праблемы не толькі адміністрацыйнымі мерамі, але эканамічнымі, культурнымі і выхаваўчымі.

Таму прынятыя меры не паўплывалі на стан п'янства. У 1971 г. у параўнанні з 1966 г. больш чым у 2,2 разы было затрымана асоб у п'яным выглядзе, у адносінах да якіх прымаліся меры органамі міліцыі. У 1971 г.

з 3806 злосных п’яніц 1104 былі накіраваны на прымусовае лячэнне ў ЛПП. У 1966–1971 гг. сярод такіх асоб значыўся 2791 член і кандыдат у члены КПСС, 5848 членаў ВЛКСМ і 1403 непаўналетніх ва ўзросце 16–17 гадоў [6, арк. 36]. П’янства закранала ўсе сацыяльныя і ўзроставыя слаі грамадства.

Такое становішча не адпавядала праграмным мэтам партыі. 21 чэрвеня 1972 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыняў Указ, а 14 ліпеня 1972 г. Савет Міністраў БССР пастанову № 215 «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы супраць п’янства і алкагалізму» [7, арк. 16, 17]. 19 ліпеня 1972 г. бюро ЦК КПБ прыняло «Мерапрыемствы па выкананню пастановы ЦК КПСС "Аб мерах па ўзмаценню барацьбы супраць п’янства і алкагалізму"» [8, арк. 9]. Новым у гэтых актах стала рашэнне аб утварэнні пры Савеце Міністраў БССР Камісіі для каардынацыі дзейнасці дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый, накіраваных на барацьбу з п’янствам і спыненне яго праяў. Узначаліў яе намеснік старшыні Саўміна БССР У. Е. Лабанок. Намеснікам быў зацверджаны міністр унутраных спраў БССР А. А. Клімаўскі, а членам Камісіі – яго намеснік П. С. Жук [7, арк. 23–24]. Савету Міністраў БССР даручалася вырашыць пытанне аб адкрыцці ў абласцях ЛПП для прымусовага лячэння хранічных алкаголікаў і злосных п’яніц. Праваахоўным органам загадвалася распрацаваць і ажыццявіць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненню барацьбы з п’янствам і ўстанавіць кантроль за выкананнем заканадаўства, якое рэгулюе гандаль алкагольнымі напоямі [8, арк. 48, 49].

У русле такога падыходу толькі ЦК КПБ за 1972–1975 гг. чатыры разы разглядаў пытанні ўзмацнення барацьбы з п’янствам і алкагалізмам на прыкладзе дзейнасці кіраўніцтва Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцей і рэспублікі ў цэлым, у падрыхтоўцы якіх прынялі ўдзел і супрацоўнікі МУС БССР [9, арк. 19, 62, 63; 10, арк 30; 11, арк 27; 12, арк. 34]. Такі падыход дазволіў лепш выявіць становішча спраў на месцах. У многіх раёнах створаныя пры райвыканкамах камісіі па барацьбе з п’янствам бяздзейнічалі. Не існавала неабходнага ўзаемадзеяння органаў аховы здароўя і міліцыі па выяўленню і ўзяццю на ўлік асоб, схільных да п’янства. Па даных Гомельскага УУС іх у вобласці мелася 372, а абласнога аддзела аховы здароўя – больш за 1200 чалавек. У Мазыры, па даных міліцыі, пражывала 37 злосных п’яніц, а гарадскога аддзела аховы здароўя – больш за 200 [12, арк. 63]. Не лепшае становішча значылася і ў іншых абласцях рэспублікі.

Вялікія сілы на барацьбу з п’янствам былі накіраваны і непасрэдна міліцыяй. МУС БССР і іншыя праваахоўныя органы на месцах распрацавалі і зацвердзілі на бюро абкамаў КПБ спецыяльныя мерапрыемствы па ўзмацненню барацьбы супраць п’янства і алкагалізму і забеспячэнню ўзорнага грамадскага парадку ў гарадах і іншых населеных пунктах [13, арк. 11]. Адной з найбольш эфектыўных форм дзейнасці міліцыі стала правядзенне рэйдаў па праверцы выканання правілаў гандлю спіртнымі напіткамі, спыненню выпадкаў распіцця іх у забароненых месцах, своечасоваму затрыманню грамадзянаў, якія знаходзіліся ў грамадскіх месцах у п’яным вы-

глядзе і г. д. Адзін з іх быў праведзены 10–11 жніўня 1972 г. МУС БССР у г. Мінску па рэкамендацыі партыйных органаў. У ім прыняло ўдзел 1200 супрацоўнікаў міліцыі і каля 2500 прадстаўнікоў грамадкасці: членаў ДНД, пазаштатных супрацоўнікаў міліцыі, грамадскіх аўтаінспектараў, выкарыстана 133 аўтамабілі, фота- і кінаапараты, магнітафоны, іншыя тэхнічныя сродкі, неабходныя для фіксіравання фактаў непрыстойных паводзін правапарушальнікаў. У ходзе рэйда праверана 209 прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, 208 грамадскіх месцаў, 84 інтэрнаты, 51 прамысловае прадпрыемства, наведаны 172 неўладкаваныя сям'і, 139 асоб, схільных да злоўжывання спіртных напіткаў; выяўлена і затрымана 9 чалавек, якія здзейснілі крымінальныя злачынствы, 78 чалавек – за дробнае хуліганства, 1078 – за з'яўленне ў п'яным выглядзе ў грамадскіх месцах і распіццё спіртных напіткаў, 1467 – за парушэнне правіл руху транспарта і пешаходаў. Усяго ў ходзе рэйда за супрацьпраўныя дзеянні было затрымана 2600 чалавек, ці ў 10 разоў болей, чым у сярэднім за будні дзень. Матывацыя выпівак: 56,7 % – па прычыне завяршэння рабочага дня, 18,1 % – па выпадку атрымання зарплаты ці прэміі, 9,6 % – у сувязі з накіраваннем у адпачынак. 94,6 % выпівак адбывалася, дзе прыдзецца: у скверах, на вуліцах, у парках, магазінах па месцы набыцця спіртнога і толькі 2,0 % – у рэстаранах і кафэ.

Многія грамадзяне ў ходзе рэйда станоўча адносіліся да барацьбы з п'янствам, але адначасова былі незадаволены тым, што не існавала шырокай сеткі танных бараў і закусачных, месцаў для культурнага правядзення вольнага часу. Прапаноўвалася замяніць грашовыя штрафы на п'яніц прымусовымі фізічнымі працамі па добраўпарадкаванню грамадскіх месцаў. Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў, які азнаёміўмя з вынікамі рэйду, абмежаваўся агульнымі даручэннямі. У прыватнасці, «Мінскаму ГК КПБ (т. Слюнькоў): 1. Разглядзець запіску МУС БССР на бюро ГК КПБ. 2. Па канкрэтных фактах прыняць меры. 3. Развярнуць у калектывах прадпрыемстваў горада работу па прыняццю кодэксаў рабочага гонару. 4. Узмацніць работу па выхаванню працоўных калектываў і моладзі па барацьбе з п'янствам» [14, арк. 213–219, 221]. Эфектыўнага нічога не прапаноўвалася. Стэрэатып ранейшы. Аналагічныя праверкі праводзіліся час ад часу ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі.

У барацьбе з п'янствам павысілася роля медыцынскіх працвярэзнікаў пры органах міліцыі. У Гомелі і Мінску арганізаваны дыспетчарскія службы дзеля кіравання аўтаэкіпажамі спецыяльнай медыцынскай службы. У Слуцку, Салігорску і Маладзечна дзейнічалі экіпажы па падбору п'яных. За перыяд з 1972 г. па 1974 г. колькасць пабываўшых у працвярэзніках павялічылася з 89 892 чалавек да 109 112, ці рост у 1,2 разы. Расходы на іх утрыманне пакрываліся за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў [15, арк. 73]. Некалькі палепшылася арганізацыя прымусовага лячэння і працоўнага перавыхавання алкаголікаў у ЛПП Светлагорска на 1300 месцаў і Мазыра на 1000 месцаў. У 1972 г. у іх было накіравана 1077 чалавек,

а ў 1974 г. – 2032. За гэты час павялічана наркалагічных кабінетаў з 9 да 25, псіханеўралагічных кабінетаў – з 96 да 121. Усяго было пастаўлена на ўлік хворых алкагалізмам і алкагольнымі псіхозамі ў 1972 г. 29 177 чалавек, ці 3,2 на 1000 насельніцтва [16, арк. 24].

Нягледзячы на прымаемыя меры, п'янства прадаўжала заставацца распаўсюджанай з'явай і каталізатарам розных антыправавых праяў. Калі ў 1971 г. асобамі ў нецвярозым стане было ажыццёўлена 51,0 % злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку, то ў 1975 г. – 55,8 %. Штогод імі здзяйснялася ад 60,0 % да 80,0 % найбольш небяспечных злачынстваў [17, арк. 11].

Кіраўніцтва рэспублікі не было зацікаўлена ў такім становішчы, але і прапанаваць новага нічога не змагло. 1 жніўня 1974 г. былі выдадзены ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб прымусовым лячэнні і працоўным перавыхаванні хранічных алкаголікаў», «Палажэнне аб лячэбна-працоўных прафілакторыях для хранічных алкаголікаў» і пастанова Савета Міністраў БССР аб парадку прымянення гэтага Указу [18]. Бюро ЦК КП Беларусі 5 жніўня 1975 г. разглядала пытанне «Аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС ад 16 мая 1972 г. «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы супраць п'янства і алкагалізму» [19, арк. 13]. Праца МУС БССР была прызнана нездавальняючай. Яму і выканкамам мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных ставілася задача ў двухмесячны тэрмін завяршыць стварэнне спецыялізаваных ДНД для барацьбы з п'янствам і алкагалізмам. Паколькі будаўніцтва ЛПП у кожнай вобласці было правалена, то бюро ЦК КПБ зноў ставіла вырашэнне гэтай задачы ў бліжэйшыя 3–4 гады, а таксама адкрыццё да 1977 г. 50 наркалагічных кабінетаў і рэспубліканскага ЛПП для жанчын-алкаголікаў [20, арк. 34–38, 42–43].

У другой палове 70-х – першай палове 80-х гг. цікавасць партыйна-савецкіх органаў да праблем п'янства і алкагалізму спадае. Такія адносіны тлумачыліся не абыякавасцю да гэтай праблемы. Паўсталі больш складаныя, звязаныя з падзеннем тэмпаў эканамічнага развіцця, ускладненнем сацыяльнага становішча насельніцтва, развязваннем вайны ў Афганістане, са з'яўленнем наркаманіі. Складанасць становішча прывяла да павелічэння прадажы алкагольных напіткаў як аднаго з важнейшых сродкаў папаўнення дзяржаўнага бюджэту. Калі ў 1960 г. у Беларусі мелася толькі два спецыялізаваныя магазіны па продажы віна-водачных вырабаў, то ў 1977 г. – ужо 33 [21, с. 232, 233].

Становішча з ужываннем алкагольных напіткаў і на гэтай аснове здзяйсненне супрацьпраўных дзеянняў павялічылася. У 1976 г. на душу насельніцтва ў рэспубліцы ўжыта 37,5 л, ці на 11,5 л больш, чым у 1970 г. [17, арк. 19]. У 1974 г. зарэгістравана 152 427 асобаў у п'яным стане, да якіх міліцыяй былі прыняты меры, а ў 1984 г. іх было ўжо 351 355, ці рост ў 2,3 разы. За гэты час мерам адміністрацыйнага ўздзеяння было падвергнута адпаведна 2631 і 7643 [22, арк. 16; 23, арк. 177] (рост у 2,9 разы)

падлеткаў за распіццё спіртных напіткаў і з'яўленне ў п'яным выглядзе ў грамадскіх месцах.

Вынікі маглі быць намнога горшымі, калі б не пастаянная праца міліцыі ў гэтым кірунку, асабліва службы аховы грамадскага парадку. Штогодна ўпраўленне АГП МУС БССР інфармавала кіраўніцтва БССР аб сваёй дзейнасці па ўзмацненню барацьбы з п'янствам і алкагалізмам [24, арк. 5; 25, арк. 22, 23; 26, арк. 15, 17]. Асабліва ўзмацнілася барацьба міліцыі з гэтым злом у 1985–1987 гг. у сувязі з патрабаваннямі пастановы ЦК КПСС ад 7 мая 1985 г. «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму» [27, с. 21–27], аналагічнай пастановы Савета Міністраў СССР і Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 16 мая 1985 г. [28, арк. 62–72; 29, арк. 3, 9]. Падобныя рашэнні былі прыняты і вышыйшымі органамі ўлады і кіравання Беларусі, у якіх асаблівая ўвага праваахоўных органаў накіроўвалася на карэнную перабудову прафілактычнай дзейнасці, узмацненне барацьбы з самагонаварэннем, спекулянтамі спіртным [28, арк. 62–72]. Ужо 28 мая 1985 г. на пашыраным пасяджэнні калегіі МУС БССР былі разгледжаны задачы органаў унутранных спраў рэспублікі па выкананню гэтых нарматыўных прававых актаў.

З гэтага часу была ўведзена сістэма, у адпаведнасці з якой пытанні работы па пераадоленню п'янства і алкагалізму сталі разлядацца ў ГА-РАУС штотыдзельна, ва УУС – штомесячна, МУС БССР – штоквартальна. З чэрвеня 1985 г. за кошт пераразмеркавання сіл, прыцягнення да патрулявання супрацоўнікаў у асабісты час на трэцюю частку павялічылася колькасць нарадаў міліцыі ў грамадскіх месцах. Больш жорсткімі, але ў межах закона, сталі прымяняцца меры ўздзеяння на асобаў, якія дапускалі факты п'янства. Аб усіх парушальніках антыалкагольнага заканадаўства аператыўна інфарміраваліся працоўныя калектывы, а аб членах КПСС, ВЛКСМ і кіраўніках – адпаведныя партыйныя, савецкія і камсамольскія органы [30, с. 506].

Прынятыя меры далі і першыя станоўчыя вынікі. Па даных бюро ЦК КПБ, згубленні рабочага часу ў 1985 г. у параўнанні з папярэднім у прамысловасці знізіліся на 8,8 %, у будаўніцтве – на 15,5 %. Працазгубленні з-за прагулаў зменшыліся адпаведна на 20,5 % і 28,2 % [31, арк. 6, 47].

У ліпені 1986 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР устанавіў адміністрацыйную адказнасць за куплю спіртых напіткаў для асоб, якія не дасягнулі 21 года. За гэта ўстанаўліваўся штраф памерам да 50 руб., калі гэтыя дзеянні па свайму характару не цягнулі за сабою ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам крымінальнай адказнасці [32, арк. 7, 50].

Заканадаўчая база стварыла прававы карыдор для дзейнасці міліцыі. Усяго, па даных міністра ўнутранных спраў Беларусі В. А. Піскарова, да адказнасці за п'янства ў 1985–1987 гг. было прыцягнута 1,2 млн чалавек, ці 16,8 % працуючых у народнай гаспадарцы [33]. Адначасова назіралася тэндэнцыя змяншэння колькасці асоб, якія ўтрымліваліся ў працвярэзніках:

у 1984 г. – 180 824, у 1987 г. – 126 027 чалавек (змяншэнне ў 1,4 разы), і адначасова тэндэнцыя росту колькасці злосных п’яніц, якія былі на ўліку міліцыі: 1984 г. – 171 248, 1987 г. – 186 380 чалавек [34, арк. 177] (рост у 1,08 разы). За 1985–1987 гг. колькасць злачынстваў зменшылася амаль на 10 тыс., узровень злачыннасці – з 58,1 да 49,1 [35, арк. 112], а выяўленых асоб, здзейсніўшых злачынствы, – з 51 тыс да 39,4 тыс., з іх у стадыі ап’янення ў 1985 г. было 16 тыс., у 1987 г. – 9,7 тыс. чалавек [36, арк. 11; 37, арк. 1] (у 1,6 разы менш).

Цяжка пагадзіцца з некаторымі меркаваннямі аб тым, што ў барацьбе з п’янствам і алкагалізмам у 1985–1987 гг. былі дасягнуты вялікія поспехі. У гэтым кірунку ўзнікла больш праблем, чым поспехаў. Аналіз паказвае, што афіцыйнае змяншэнне п’янства адбылося, па-першае, за кошт зніжэння рэалізацыі алкагольных напіткаў. У 1987 г. у параўнанні з 1985 г. у два разы (!) знізілася вытворчасць і рэалізацыя спіртных напіткаў у Беларусі [38, арк. 2]. Аднак гэтага часу хапіла для таго, каб пачалася масавая міграцыя самагонаварэння з вёскі ў горад, дзе яго вельмі складана выявіць. Па-другое, некаторыя пазітыўныя перамены ў барацьбе з п’янствам былі атрыманы ад рэпрэсіўных мер, а не ад карэнных перамен у свядомасці людзей. Сацыяльнае зло не зменшылася ў рэальнасці, а было загнана ў падполле. Практыка 1985–1987 гг. яшчэ раз паказала, што толькі забаронай нельга станоўча вырашыць ні адну праблему. Ад яе можна пазбавіцца толькі знешне, але не ўнутрана.

З другой паловы 1988 г. пачынаецца паступовы рост зарэгістраваных выпадкаў п’янства і алкагалізму. У 1984 г. рэалізацыя спіртных напіткаў штомесячна ўзрастала на 15–18 %, а колькасць злачынстваў, ажыццёўленых п’янымі, – на 35–40 % [35, арк. 113]. Калі ў 1988 г. міліцыяй былі выяўлены 245 374 асобы, якія дапусцілі парушэнні антыалкагольнага заканадаўства, то ў 1991 г. – 409 696 [39, арк. 166; 40, арк. 17, 18, 27] (рост у 1,6 раза).

Усе гэта сведчыла, што масіраваная татальная кампанія барацьбы з п’янствам і алкагалізмам, абвешчаная кіраўніцтвам дзяржавы, пацярпела крах. І гэта стала адным з фактараў падрыву ўсёй палітыкі перабудовы савецкага грамадства, хаця міліцыя, у тым ліку і Беларусі, прымала актыўныя меры па зацвярджэнню здаровага вобраза жыцця сярод насельніцтва.

Складанае сацыяльна-эканамічнае становішча прымусіла кіраўніцтва дзяржавы адыйсці ад часткі раней абвешчаных мераў па барацьбе з п’янствам і алкагалізмам і пайсці на павелічэнне вытворчасці і рэалізацыі алкагольных напіткаў. Калі ў 1986 г. было прададзена 5569 тыс. дэкалітраў водкі і лікёра-водачных вырабаў, 132 тыс. дэкалітраў кан’яку, 26 801 тыс. дэкалітраў піва, то ў 1989 г. адпаведна 6672 тыс., 163 тыс. і 31 698 тыс. дэкалітраў [41, с. 69].

Такім чынам, усе службы міліцыі, асабліва аховы грамадскага парадку, былі заняты актыўным выкананнем задач дзяржавы па барацьбе з п’янствам

і алкагалізмам. І нават тады, калі чарговыя кампаніі барацьбы з гэтым сацыяльным злом былі завершаны, міліцыя практычна адна працягвала актыўна весці прафілактычную працу па спыненню распіцця спіртных напіткаў у грамадскіх месцах, вырабу і прадажы самагонкі. Яе супрацоўнікі разумелі, што п'янства і алкагалізм з'яўляюцца актыўным стымулятарам для многіх грамадзян учыняць супрацьпраўныя дзеянні.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Архіў МУС Рэспублікі Беларусь (Архіў МУС РБ). – Фонд 50. – Воп. 2. – Спр. 80.
2. Архіў МУС РБ. – Фонд 25. – Воп. 1. – Спр. 100.
3. Архіў МУС РБ. – Фонд 49. – Воп. 1. – Спр. 32.
4. Архіў МУС РБ. – Спр. 65.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 7. – Воп. 5. – Спр. 3459.
6. Архіў МУС РБ. – Фонд 26. – Воп. 2. – Спр. 125.
7. Архіў МУС РБ. – Фонд 50. – Воп. 3. – Спр. 96.
8. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 81. Спр. 2421.
9. НАРБ. – Воп. 94. Спр. 403.
10. НАРБ. – Спр. 407.
11. НАРБ. – Спр. 416.
12. НАРБ. – Воп. 81. – Спр. 2625.
13. Архіў МУС РБ. – Фонд 49. – Воп. 1. – Спр. 73.
14. НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 5. – Спр. 3834.
15. НАРБ. – Спр. 4217.
16. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 53. – Спр. 84.
17. Архіў МУС РБ. – Фонд 49. – Воп. 1. – Спр. 98.
18. ЗЗ БССР. – 1974. - № 35. – Арт. 577.
19. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 81. – Спр. 2609.
20. НАРБ. – Спр. 2625.
21. Народное хозяйство Белорусской ССР. Юбилейный стат. сб. – Минск: Беларусь,1978. – 239 с.
22. Архіў МУС РБ. – Фонд 26. – Воп. 2. – Спр. 204.
23. Архіў МУС РБ. – Спр. 378.
24. Архіў МУС РБ – Фонд 49. – Воп. 1. – Спр. 89.
25. Архіў МУС РБ. – Спр. 95.
26. Архіў МУС РБ. – Спр. 102.
27. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК (1898–1986). – М.: Политиздат, 1989. – Т. 15: 1985 –1988. – 670 с.
28. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 160. – Спр. 239.
29. НАРБ. – Спр. 280.
30. Очерки истории милиции Белорусской ССР, 1917–1987. – Минск: Беларусь, 1987. – 535 с.
31. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 160. – Спр. 439.
32. НАРБ. – Спр. 466.
33. *Пискаров, В. А.* По закону, по совести / В. А. Пискаров // На страже Октября. – 1988. – 24 июня.
34. Архіў МУС РБ. – Фонд 26. – Воп. 2. – Спр. 378.
35. Архіў МУС РБ. – Фонд 25. – Воп. 1. – Спр. 157.
36. Архіў МУС РБ. – Фонд 26. – Воп. 2. – Спр. 362.
37. Архіў МУС РБ. – Спр. 381.

38. НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 160. – Спр. 785.
39. Архіў МУС РБ. – Фонд 26. – Воп. 2. – Спр. 462.
40. Архіў МУС РБ. – Спр. 469.
41. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1989 г.: стат. ежегодник / Госкомстат БССР – Минск: Беларусь, 1990. – 272 с.

**(Дата подачи: 29.01.2016 г.)**

*Л. Н. Семенова*
Белорусский национальный технический университет, Минск
*L. Semenova*
Belarusian National Technical University, Minsk

**УДК (9)(410)329(091)**

# БРИТАНСКИЙ ТРЕД-ЮНИОНИЗМ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XIX ВЕКА О ЗЕМЕЛЬНОМ ВОПРОСЕ

# BRITISH TRADE UNIONISM AT THE SECOND PART OF XIX CENTURY ABOUT LAND QUESTION

*В статье автор на основе протоколов Британского конгресса тред-юнионов (БКТ) 1860–1880-х гг. реконструирует взгляды цехового юнионизма о путях решения земельного вопроса. Существовавшая в то время в Британии система лендлордизма была признана тред-юнионистами неприемлемой, так как препятствовала развитию сельского хозяйства и мелкой трудовой собственности. Первоначально тред-юнионисты выдвинули план развития мелкой частной собственности на землю. Но оказалось, что в условиях системы лендлордизма он неосуществим. Затем программным требованием британского тред-юнионизма стала национализация земли.*

*Ключевые слова: тред-юнионизм; земельный вопрос; лендлордизм; рыночная система; национализация.*

*On the base the British Trade Union Congress Reports (TUC) 1860–1880 years the author of this article reconstructed the views of the shop unionism on methods decision of the land question. Landlordism system existed at Great Britain in that time was rejected by trade unionists because of it prevented from agriculture development and small labour property. At the first time trade unionists put forward plan of the development small private land property. But in the conditions landlordism system it was not realized. Then the land nationalization was become the British trade unionism program.*

*Key words: trade unionism; the land question; landlordism; the market system; nationalization.*

Сущность земельного вопроса заключается в распределении земли, юридически закрепленном правами собственности, и отношении к такому распределению в обществе. Земельный вопрос являлся главнейшим нервом доиндустриальных феодальных обществ, поскольку земля была основным экономическим ресурсом и организующим стержнем сословной и политической структуры. Индустриальные капиталистические общества отодвинули земельный вопрос на второй план после рабочего, но не сняли его